Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
_______________ Ю. П. Бондар
«___»________________ 2014 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/вуч.

# ПАСТАНОЎКА ГОЛАСУ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-01 Народная творчасць*
*(харавая музыка), спецыялізацыі*
*1-18 01 01-01 02 Харавая музыка народная*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2014

**СКЛАДАЛЬНІК**
*І. М. Грамовіч,* дацэнт кафедры народнапесеннай творчасці, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*А. І. Смагін,* прафесар кафедры культуралогіі ПУА «Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава», доктар мастацтвазнаўства;
*А. В. Пякуцька,* загадчык, прафесар кафедры харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, прафесар

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* беларускай народнапесеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 22.10.2013 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 19.12.2013 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: І. М. Грамовіч

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Пастаноўка голасу» займае важнае месца па падрыхтоўцы кіраўнікоў хору. Гэта адна з галоўных прафілюючых дысцыплін, засваенне якой дапамагае падрыхтаваць высокаадукаванага спецыяліста.

Кіраўнік народнага калектыву павінен валодаць народнай манерай спеваў, ведаць методыку навучання пастаноўкі голасу, творча падыходзіць да вырашэння важнай праблемы сучаснасці – захавання, развіцця і прапаганды традыцый народнапесеннага выканальніцтва, садзейнічаць павышэнню прафесійнага ўзроўню выканальніцкага майстэрства фальклорных калектываў і асобных выканаўцаў.

Практычнае знаёмства студэнта з народнай манерай спеваў пачынаецца з выпрацоўкі навыкаў песеннага дыхання, апоры гуку, дыкцыі і атакі гуку, авалодвання правільным гукаўтварэннем на вакальных практыкаваннях і творах. Важным этапам вучэбнай работы ў класе па пастаноўцы голасу з'яўляецца вывучэнне і авалоданне рэгіянальнымі песеннымі традыцыямі і выканальніцкімі манерамі розных рэгіёнаў Беларусі.

Засваенне дысцыпліны шчыльна звязана з вывучэннем такіх дысцыплін, як «Харавы клас», «Выканальніцкае майстэрства», «Тэорыя музыкі», «Беларуская народнапесенная творчасць» і інш.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны «Пастаноўка голасу» – даць будучаму спецыялісту неабходныя веды па авалодванні народнай манерай спеваў, выхаваць высокаадукаванага спецыяліста ў галіне народнапесеннага выканальніцтва.

*Асноўныя задачы:*

– вывучэнне тэхнікі спеваў, у якой вакальная праца накіравана на прастату, натуральнасць і характарнасць спеваў, інструментальную роўнасць гучання голасу;

– выхаванне размоўнай манеры спеваў, выразна асэнсаванага гукаўтварэння праз інтанацыйна-сэнсавы пасыл, які раскрывае агульны змест твора;

– развіццё артыстычных даных праз разуменне драматургіі народнай песні;

– выхаванне музычна-выканальніцкага і мастацкага густу на лепшых узорах народнай і аматарскай творчасці і на падставе вывучэння вопыту выдатных майстроў народных спеваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– механізм гукаўтварэння і гукавядзення ў народнай манеры спеваў;

– тэхніку правільнага песеннага дыхання;

– народнапесенныя выканальніцкія прыёмы;

– рэгіянальныя асаблівасці народнапесеннага выканальніцтва;

*умець:*

– свабодна і прафесійна валодаць народнай манерай спеваў;

– карыстацца вакальна-тэхнічнымі навыкамі народнай манеры спеваў;

– выконваць творы а капэла і з суправаджэннем;

– выкарыстоўваць мастацка-выразныя сродкі для перадачы зместу выконваемага вакальнага твора;

– карыстацца прынцыпамі падбору рэпертуару;

*валодаць:*

– методыкай выкладання сольных спеваў;

– методыкай работы з вакальна-харавымі творамі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Пастаноўка голасу» ўсяго адведзена 378 гадзін, з якіх 132 гадзіны – аўдыторныя (індывідуальныя) заняткі. Формы кантролю ведаў студэнтаў – экзамены і залікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін (індывідуальныя заняткі) |
|---|---|
| **Раздзел I. Развіццё практычных навыкаў пастаноўкі голасу ў народнай манеры** | |
| *Тэма 1.* Уводзіны | 1 |
| *Тэма 2.* Авалодванне спеўным дыханнем і яго развіццё | 12 |
| *Тэма 3.* Набыццё навыкаў спеваў кантылены | 15 |
| *Тэма 4.* Фарміраванне дакладнай дыкцыі, работа над словам. Засваенне асаблівасцей дыялектаў | 10 |
| *Тэма 5.* Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі | 8 |
| *Тэма 6.* Згладжванне рэгістравых пераходаў. Пашырэнне дыяпазону | 12 |
| *Тэма 7.* Выпрацоўка рухомасці, гібкасці і палётнасці голасу | 9 |
| **Раздзел II. Засваенне спецыфічных прыёмаў традыцыйнага народнага гукаўтварэння** | |
| *Тэма 1.* Знаёмства з асаблівасцямі дыялектаў | 6 |
| *Тэма 2.* Засваенне рэгіянальных выканальніцкіх прыёмаў народнага гукаўтварэння | 15 |
| *Тэма 3.* Авалоданне навыкамі імправізацыі | 18 |
| **Раздзел III.Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака** | |
| *Тэма 1.* Авалоданне сродкамі мастацкай выразнасці | 6 |
| *Тэма 2.* Работа над стварэннем мастацкага вобраза | 12 |
| *Тэма 3.* Падбор і фарміраванне рэпертуару | 8 |
| **Усяго...** | **132** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел I. Развіццё практычных навыкаў пастаноўкі голасу ў народнай манеры

*Тэма 1. Уводзіны*

Задачы курса. Месца і роля заняткаў па пастаноўцы голасу ў станаўленні творчай асобы выканаўцы народнай песні. Вызначэнне тыпу і характару голасу, тэмпераменту, артыстычных і музычных даных навучэнца, творчай схільнасці да таго ці іншага жанру.

*Тэма 2. Авалодванне спеўным дыханнем і яго развіццё*

Песенная ўстаноўка. Віды дыхання. Кіраванне патокам выдыхаемага паветра. Апора дыхання і апора гуку. Авалодванне спеўным дыханнем і яго развіццё. Аваладанне філіроўкай гуку. Знаёмства з разнастайнымі методыкамі паляпшэння спеўнага дыхання і іх апрабаванне.

*Тэма 3. Набыццё навыкаў спеваў кантылены*

Выпрацоўка кантылены – плаўнага, звязнага, бесперапыннага, свабоднага гучання. Валоданне легата (дакладнага пераходу ад гуку да гуку), партамента, глісанда (слізганне па ўсіх прамежкавых тонах). Набыццё навыкаў спеваў у прымарнай зоне. Спевы практыкаванняў на невялікія інтэрвалы. Дасягненне вакальнага тонусу, мабілізацыі галасавога апарату, уключэнне ў работу патрэбных стэрэатыпаў і асацыяцый. Выпрацоўка навыкаў спеваў у межах квінты, сексты, септымы для жаночых галасоў, у межах септымы, актавы для мужчынскіх галасоў. Ужыванне розных відаў атакі: мяккай, цвёрдай, прыдыхальнай. Удасканальванне плаўнага гукавядзення з ужываннем розных практыкаванняў.

*Тэма 4. Фарміраванне дакладнай дыкцыі, работа над словам. Засваенне асаблівасцей дыялектаў*

Праца над дыкцыяй пры дапамозе спецыяльных практыкаванняў. Эканомная артыкуляцыя, натуральнае вымаўленне слоў. Аб'яднанне розных галосных. Вымаўленне зычных гукаў. Спалучэнні галосных і зычных гукаў. Трэніровачныя моўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практыкаванні. Трэніровачныя вакальна-моўныя практыкаванні. Авалодванне рэгіянальнымі дыялектнымі асаблівасцямі.

*Тэма 5. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі*

Выяўленне індывідуальных недахопаў і шляхоў іх пераадолення. Замацаванне песеннай устаноўкі і развіццё спеўных навыкаў, вызваленне песеннага апарату ад напружанасці, ліквідацыя дэфектаў гукаўтварэння, дакладная перадача мелодыі (рытму, гукавышыннасці, фразіроўкі). Замацаванне высокай пазіцыі для падцягвання інтанацыі.

*Тэма 6. Згладжванне рэгістравых пераходаў. Пашырэнне дыяпазону*

Знаёмства з рэгістрамі голасу. Засваенне тэхналагічных прыёмаў развіцця дыяпазону. Авалодванне рэгістравымі пераходамі. Авалоданне галаўным і грудным рэзаніраваннем, навыкамі іх аб'яднання. Праца над высокай пазіцыяй гуку. Ускладненне вакальных практыкаванняў, папеўкі больш шырокага дыяпазону. Скачкі, розныя рытмічныя малюнкі, складаныя групоўкі нот. Пашырэнне дыяпазону груднога гучання ў межах септымы, актавы для жаночых галасоў; актавы, дэцымы для мужчынскіх галасоў. Выкананне вакальных практыкаванняў і папевак больш шырокага дыяпазону. Авалодванне навыкамі спеваў скачкоў, папевак у розных тэмпах і больш складаных спалучэннях гукаў.

*Тэма 7. Выпрацоўка рухомасці, гібкасці і палётнасці голасу*

Удасканальванне вакальнай тэхнікі пры дапамозе практыкаванняў па выраўноўванні галосных па ўсім дыяпазоне. Спевы практыкаванняў на рухомасць голасу ў хуткіх тэмпах, са скачкамі ўверх, уніз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Засваенне спецыфічных прыёмаў традыцыйнага народнага гукаўтварэння

*Тэма 1. Знаёмства з асаблівасцямі дыялектаў*

Засваенне спецыфікі вымаўлення розных гаворак. Пераймanне народна-выканальніцкай манеры і прыёмаў. Рэдуцыраваныя галосныя. Засваенне тэхнікі спеваў рэдуцыраваных галосных.

*Тэма 2. Засваенне рэгіянальных выканальніцкіх прыёмаў народнага гукаўтварэння*

Вывучэнне традыцыйнага народнапесеннага выканальніцтва. Засваенне тэхнікі выканання народных мелізмаў. Спевы асноўных і спецыфічных прыёмаў народнага гукаўтварэння: расцягванні слоў на дадатковыя галосныя, паўторнасць складоў, арнаментыкі, слізганняў, прыгукаў, народных мелізмаў і мардэнтаў, глісандуючых гукаў, спадаў, абрываў складоў і інш.

*Тэма 3. Авалоданне навыкамі імправізацыі*

Знаёмства з метадамі імправізацыйнага выканальніцтва на прыкладзе фальклорнага матэрыялу. Вывучэнне стылявой разнастайнасці беларускага песеннага фальклору. Набыццё навыкаў выканання ўзораў аўтэнтычнага фальклору.

## Раздзел III.Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака

*Тэма 1. Авалоданне сродкамі мастацкай выразнасці*

Выкананне твораў у павольных і хуткіх тэмпах. Выкарыстанне дынамічных адценняў у інтэрпрэтацыі народнай песні. Работа над майстэрствам выканання разнажанравых беларускіх народных песень. Выкарыстанне тэмбральнай афарбоўкі голасу для перадачы сэнсу песні. Праца над фразіроўкай, вакальна-выканальніцкае ўдасканальванне твора.

*Тэма 2. Работа над стварэннем мастацкага вобраза*

Выкарыстанне спецыфічных метадаў і кірункаў у інтэрпрэтацыі народнай песні. Творчы падыход да стварэння сюжэтнай лініі. Праца над драматургіяй народнай песні. Асэнсаваны падыход да інтанавання музычна-паэтычнага тэксту. Удасканальванне выразнасці і вобразнасці выканання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 3. Падбор і фарміраванне рэпертуару*

Выкарыстанне разнажанравага рэпертуару. Дыферэнцыраваны падыход да выбару народных песень. Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака. Актыўная канцэртная дзейнасць. Арганізацыя самастойнай работы па падборы рэпертуару. Развіццё прафесіяналізму ў народнапесенным выканальніцтве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / уклад.: В. Д. Ліцвінка, Г. Д. Кутырова. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 250 с.

*2.* Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / уклад.: В. А. Захарава, Р. М. Кавалёва, В. Д. Ліцвінка. – Мінск : Універсітэцкае, 1989. – 384 с.

*3. Варфаламеева, Т. Б.* Песні Беларускага Панямоння / Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 1980. – 220 с.

*4.* Веснавыя песні / рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 608 с.

*5.* Вянок беларускіх народных песень / запіс У. Раговіча. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 432 с.

*6. Елатов, В. И.* Песни восточнославянской общности / В. И. Елатов. – Минск : Наука и техника, 1977. – 245 с.

*7.* Жартоўныя песні / рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 340 с.

*8.* Жніўныя песні / рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 348 с.

*9. Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Паазер'я / З. Я. Мажэйка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 493 с.

*10. Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Падняпроўя / З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 276 с.

*11. Можейко, З. Я.* Песни Белорусского Полесья / З. Я. Можейко. – М. : Сов. композитор, 1983. – Вып. 1. – 184 с.

*12. Можейко, З. Я.* Песни Белорусского Полесья / З. Я. Можейко. – М. : Сов. композитор, 1984. – Вып. 2. – 181 с.

*13.* Песні Беласточчыны / А. С. Фядосік. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – 237 с.

*14. Раговіч, У. І.* Песенны фальклор Палесся. Песні святочнага календара : у 2 т. / У. І. Раговіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2001. – Т.1. – 526 с.

*15.* Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Магілёўскае Падняпроўе / уклад. Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т.1. – 796 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*16.* Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.1. Магілёўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 797 с.

*Вучэбна-метадычная*

1. *Дмитриев, Л. Б.* Основы вокальной методики / Л. Б. Дмитриев. – М. : Музыка, 2000. – 367 с.

2. *Калугина, Н. В.* Методика работы с русским народным хором: учебник для муз. вузов / Н. В. Калугина. – М. : Музыка, 1977. – 255 с.

3. *Малышева, Н. М.* О пении / Н. М. Малышева. – М. : Сов. композитор, 1988. – 135 с.

4. *Руднева, А. В.* Русский народный хор и работа с ним / А. В. Руднева. – М. : Сов. Россия, 1974. – 88 с.

5. *Савельева, В. П.* Проблемы вокального обучения руководителей народных хоров / В. П.Савельева // Вопросы хорового образования: сб. тр. / Мин-во культуры РСФСР, Гос. муз.-пед. ин-т. – М., 1985. – Вып. 77. – С. 117–131.

6. *Шамина, Л. В.* Работа с самодеятельным хоровым коллективом / Л. В. Шамина. – М. : Музыка,1983. – 176 с.

*Дадатковая*

1. *Варфоломеева, Т. Б.* Северобелорусская свадьба / Т. Б. Варфоломеева. – Минск : Наука и техника, 1988. – 154 с.

2. Вяселле: Абрад / уклад. К. А. Цвіркі. – Мінск : Беларус. навука. – 2004. – 683 с.

3. Гульні, забавы, ігрышчы / уклад. А. Ю. Лозкі. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 534 с.

4. *Емельянов, В. В.* Развитие голоса. Координация и тренаж / В. В. Емельянов. – СПб : Лань, 1997. – 39 с.

5. *Крывіцкі, А. А.* Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі / А. А. Крывіцкі; Т-ва па распаўсюджанні паліт. і навук. ведаў БССР. – Мінск, 1961. – 40 с.

6. *Мухаринская, Л. С.* Белорусская народная песня. История развития : Очерки / Л. С. Мухаринская; под ред. З. Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1997. – 216 с.

7. *Пономарев, Я. А.* Фазы творческого процесса. Исследование проблем психологии творчества / Я. А. Пономарев. – М. : Наука, 1983. – С. 3–27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. *Рожина, Л. Н.* Развитие эмоционального мира личности : учеб.-метод. пособие / Л. Н. Рожина. – Минск : Універсітэцкае, 1999. – 256 с.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

1. Кантроль за самастойным выкананнем заданняў на развіццё і ўмацаванне дыхання, дыкцыі, інтанацыі.
2. Экзамен.
3. Залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПАСТАНОЎКА ГОЛАСУ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-01 Народная творчасць*
*(харавая музыка), спецыялізацыі*
*1-18 01 01-01 02 Харавая музыка народная*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. Д. Захарэвіч

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60x84 1/16.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,76. Ул.-выд. арк. 0,40. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.